*Сёння ў нумары:*

● ДЛЯ ЧЫТАЧОЎ БДУ ● ЛАБАРАТОРЫЯ ФАКУЛЬТЭТА ● СЕСІЯ ● СТАРОНКА НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ ● СПОРТ ● ЗДЫМАЮЦЬ ФОТААМАТАРЫ ● ГУМАРЫСТЫЧНЫ ПЕРАПЫНАК

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 22 (1096) ● Чацвер, 12 чэрвеня 1975 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

## ІДЗЕ ЧАС—РАСТУЦЬ ПАТРАБАВАННІ

Выйшаў з друку і рассылаецца па адпаведных адрасах тэматычны план выпуску літаратуры на 1976 год выдавецтвам Белдзяржуніверсітэта. Што ж атрымаюць ад нас чытачы ў наступным годзе?

Выдавецтва падрыхтуе і выпусціць у свет 17 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў. Сярод іх варта адзначыць наступныя: «Асновы марксісцка - ленінскай этыкі» (С. Д. Лапцёнак), «Навукова-метадычныя асновы выкладання палітычнай эканоміі» (У. К. Драчоў), «Лекцыі па гісторыі рускай літаратуры канца XIX — пачатку XX ст.» (Ф. І. Куляшоў), «Замежная літаратура» (В. М. Цімафеева, Б. П. Міцкевіч), «Аўтаматызаваныя сістэмы кіравання» (А. І. Зміторвіч, Н. А. Лепяшынскі).

Цэнтральнае месца ў тэматычным плане займае вучэбна - дапаможная і манаграфічная літаратура. Тут варта адзначыць такія работы: «Партыйная арганізацыя Беларусі ў барацьбе за умацаванне дысцыпліны працы ў прамысловасці» (У. С. Багданаў), «Нараджэнне і крах аднаго міфа (аб «свабодзе творчасці» ў буржуазным грамадстве)» (Ю. А. Гусеў), «Пазітыўнае і крытычнае ў атэістычным выхаванні» (І. М. Квашніна), «Кібернетыка і законы прыгажосці» (М. І. Крукоўскі), «Метадалагічныя асновы сацыяльнага кіравання» (пад рэд. Г. П. Давідзюка), «Станаўленне навуковай тэорыі» (В. С. Сцёпін), «Ідэйная барацьба ў Беларусі напярэдадні Кастрычніка» (І. С. Чымбург), «Вытворчы калектыў і кіраванне» (У. І. Саковіч), «Франка-пруская вайна 1870—1871 гг. і Расія» (Л. М. Шнеерсон), «Зразуменне чалавека (творчасць Дастаеўскага 1840—1860 гг.)» (А. А. Станюта), «Псіхалогія ўзаемаадносін ў малых групах» (Я. Л. Каламінскі).

Як відаць з гэтага кароткага, няпоўнага пераліччэння, выдавецтва выпусціць у свет шэраг кніг, якія будуць сустрэты чытачамі, навуковай грамадскасцю з прыхільнасцю. З 1 ліпеня гэтага года калектыў выдавецтва распачне актыўную работу па непасрэднай падрыхтоўцы рукапісаў да здачы ў друкарні.

Калі паглядзець на тэмплан 1976 года з таго пункту, як прадстаўлены ў ім тыя ці іншыя кафедры універсітэта, дык пальму першынства трэба, відаць, аддаць філасофскім кафедрам БДУ. Актыўна супрацоўнічаюць у выдавецтве кафедры філалагічнага і юрыдычнага факультэтаў. Набірае тэмп кафедра навуковага камунізму.

На жаль, ёсць і такія кафедры, такія факультэты, якія на працягу не аднаго, а некалькіх гадоў запар слаба прадстаўлены ў тэматычных планах выдавецтва. Гэта перш за ўсё датычыцца факультэтаў і кафедраў (без выключэння) прыродазнаўчых навук. Сапраўды, дакладныя навукі ў тэматычным плане па раздзелу манаграфій займаюць усяго тры пазіцыі (38 друкаваных аркушаў з агульнай колькасці 1050 аркушаў, якія будзе мець выдавецтва ў наступным годзе). І гэта ў эпоху найвялікшай навукова - тэхнічнай рэвалюцыі! Каментарыі тут, відаць, не патрэбны.

Не песцяць нас увагай кафедры гістарычнага факультэта (асабліва па гісторыі Беларусі і сучаснай тэматыцы). Альбо ўзяць кафедры палітычнай эканоміі. Аб важнасці гэтай навукі сёння мы тут гаварыць, безумоўна, не будзем. У плане 1976 года значацца чатыры работы (не лічачы рукапісу У. К. Драчова), але ж іх аўтары працуюць не ў БДУ. Эканамісты універсітэта сваіх рукапісаў нам не даслалі.

Па шэрагу навуковых напрамкаў напружанае становішча, калі не прыняць тэрміновых рашучых мер, захаваецца і ў наступныя гады. Так, у праекце плана выпуску літаратуры на 1977 год, які ўжо складзены, дакладныя навукі зноў займаюць толькі чатыры пазіцыі (57 друкаваных аркушаў). Не абяцаюць нам «лёгкага жыцця» кафедры гістарычнага факультэта. Хацелася б, каб пабольш нас турбавалі кафедры гісторыі КПСС і асабліва палітычнай эканоміі.

Мы перакануча просім загадчыкаў тых кафедраў, якія яшчэ не даслалі нам сваіх заявак на публікацыі на перспектыву да 1980 года, даслаць іх. Гэта дасць магчымасць выдавецтву, нарэшце, скласці больш-менш поўны перспектыўны план выданняў на дзесятую пяцігодку.

У свой час партком прыняў рашэнне правесці на прыродазнаўчых факультэтах партыйныя сходы, на якіх прапанаваў абмеркаваць пытанне аб стане выдання навуковай літаратуры. Хацелася б, каб там, дзе такія сходы яшчэ не адбыліся, камуністы абмеркавалі гэта важнае пытанне.

Неўзабаве пасля XIII пленума ЦК КПБ, які абмеркаваў пытанне «Аб далейшым павышэнні дзейснасці ідэйна-палітычнай работы ў святле рашэнняў XXIV з'езда КПСС», выдавецтва звярнулася да некаторых кафедраў (навуковага камунізму, педагогікі і псіхалогіі, беларускай літаратуры) з канкрэтнымі прапановамі наконт падрыхтоўкі шэрагу рукапісаў па тэматыцы, якая вынікала з рашэнняў пленума ЦК КПБ. Выдавецтва чакае рэагавання на свой зварот.

Тады ж, у верасні 1974 года, выдавецтва паслала пісьмы асабіста на імя загадчыкаў кафедраў гісторыі КПСС, марксісцка-ленінскай філасофіі, навуковага камунізму, гісторыі філасофіі і логікі, у якіх паведамлялася, што дырэктыўнымі органамі за адпаведнымі кафедрамі БДУ замацавана падрыхтоўка шэрагу навукова - даследчых работ на 1976—1980 гады. Мы прасілі паведаміць нам канкрэтных выканаўцаў з тым, каб выдавецтва, зацікаўленае ў атрыманні актуальных рукапісаў, змагло ўстанавіць з імі рабочыя кантакты. Сёння, на жаль, мы вымушаны паўтарыць сваю мінулагоднюю просьбу (за выключэннем кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў).

І апошняе. Рэктарат у сваіх пастановах аб рабоце выдавецтва неаднаразова патрабаваў ад дэканаў факультэтаў і кіраўнікоў навуковых падраздзяленняў пры падвядзенні вынікаў навучальнага года на вучоных саветах абавязкова абмяркоўваць і стан выканання адпаведных абавязацельстваў перад выдавецтвам. Выдавецтва спадзяецца, што гэта патрабаванне рэктарата будзе здзейснена сёлета паўсюдна.

**В. ГРЫГОР'ЕЎ,**
галоўны рэдактар выдавецтва **БДУ**.

### БДУ—НАРОДНАЙ ГАСПАДАРЦЫ

## СТВОРАНА Ў ЛАБАРАТОРЫІ

Тыя, хто уважліва чытае часопіс «Прамысловасць Беларусі», не маглі не заўважыць цікавага артыкула члена - карэспандэнта АН БССР, прарэктара па навуковай рабоце БДУ Л. В. Валадзько «Дыяпазон даследаванняў», надрукаванага год назад. Сярод многіх вынаходніцтваў і даследаванняў вучоных нашага універсітэта, пра якія расказвалася ў артыкуле, давайце вылучым адно: распрацоўка аб'ёмных металакерамічных награвальнікаў.

Пэўна, кожнаму знаёма звычайная спіраль праса. Колькі бывае клопатаў, калі яна «перагарае», колькі часу страчваецца на рамонт праса. Недаўгавечнасць, неэканамічнасць — гэтыя фактары элементаў тыпу ЦЭН (цеплаэлектранагравальні к) былі заўважаны вучонымі даўно. І вось год назад у лабараторыі кафедры фізічнай хіміі хімічнага факультэта БДУ, якой кіруе прафесар, доктар хімічных навук А. А. Вечар, упершыню было прапанавана замяніць спіральны награвальнік металакерамічным. Гэта думка—вынік доўгіх разважанняў і вопыту—была выказана механікам лабараторыі Якавам Аксёнавым. Такім чынам, неэканамічная спіраль уступіла месца сплаву, асноўнымі элементамі якога з'яўляюцца, калі гаварыць спрошчана, гліна і металічны парашок. Так у аснову спосабу атрымання награвальнікаў быў пакладзены адзін з метадаў парашковай металургіі.

Акрамя прынцыповай канструкцыі, чым яшчэ адрозніваюцца новыя награвальнікі ад старых? Прастатой, таннасцю, даступнасцю вырабу. Камісія Курскага філіяла Усесаюзнага навукова-даследчага інстытута «Аргтэхнікі» ацаніла ўзоры награвальнікаў як патэнтна- і канкурэнтназдольныя. Тэрмін іх службы — да 10 тыс. гадзін. Прызначэнне — прымяненне ў якасці электранагравальнікаў ва ўсіх галінах тэхнікі і прамысловасці. У 1974-1975 гадах металакерамічныя награвальнікі, распрацаваныя нашымі хімікамі, укаранёны ў ламінатарах ў апараце для нанясення двухслаёвага ахоўнага пакрыцця на дакументы. Цікавая падрабязнасць: каштоўныя паперы, апрацаваныя гэтым спосабам, нельга «падправіць», «вытравіць» у іх словы або лічбы. Спраўджваецца прымаўка — «што напісана пяром, не высечыш тапаром».

У бытавую тэхніку награвальнікі новага тыпу укараняюцца сумесна з гродзенскім заводам «Электрапрыбор». Эканамічная эфектыўнасць вырабу, напрыклад, 4000 штук металакерамічных награвальнікаў складае каля 114 тыс. рублёў. І хоць новы від прадукцыі мае яшчэ многа праблем па распрацоўцы тэхналогіі і укараненню, перспектыўнасць гэтага вынаходніцтва відавочная.

**С. ШЫДЛОЎСКАЯ.**

## *П А   Б Д У*

**Ва універсітэце, як і ва ўсёй краіне, завяршаецца падрыхтоўка да выбараў, якая ажыццяўляецца на аснове непасрэднага удзелу шырокіх грамадскіх мас.**

**Выбаршчыкі, замацаваныя за выбарчым участкам № 1, змогуць 15 чэрвеня ў тэрмін аддаць свае галасы за кандыдатаў народа.**

* * *

**Абком камсамола Мінскай вобласці сумесна з тэлебачаннем правялі рэспубліканскі конкурс талентаў «Творчасць маладых». Перамаглі прадстаўнікі Мінскай вобласці. Разам з будаўнікамі, металістамі, харчавікамі і інш. свой уклад у поспех вобласці унеслі студэнты факультэта журналістыкі як самадзейныя артысты.**

**14 чэрвеня іх можна ўбачыць па тэлебачанню.**

* * *

**Выдатна выступілі на чэмпіянатах БССР па шашках старшы выкладчык ФПМ У. Бяляўскі і студэнт II курса У. Зайдэль. Бяляўскі, выйграўшы рашаючую партыю ў чэмпіёна СССР гросмайстра А. Блакхіна, стаў чэмпіёнам БССР па рускіх шашках. Роўна і упэўнена правёў турнір па міжнародных шашках У. Зайдэль і прыбавіў да звання чэмпіёна СССР сярод юнакоў званне чэмпіёна рэспублікі.**





**Экзамен па савецкаму зямельнаму праву і ахове прыроды ў студэнтаў аддзялення геаграфіі завочнага факультэта прымае дацэнт кафедры дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва Міхаіл Фёдаравіч Сцепанко.**

**Фота Т. САХАШЧЫК.**

# СТУДЭНЦКАЯ НАВУКОВАЯ

Аб студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі (СНДЛ), якая працуе пры кафедры радыёфізікі і электронікі ЗВЧ, ужо гаварылася на старонках універсітэцкай шматтыражкі. Цяпер мы раскажам аб тых студэнтах, што працуюць у ёй.

Звычайна думаюць, што калі студэнт працуе у лабараторыі, то абавязкова над сваёй курсавой або дыпломнай работай. Але у СНДЛ справа пастаулена некалькі інакш.

У лабараторыі займаюцца пытаннямі акустычнай дыягностыкі авіяматорау, гэта значыць пытаннямі статыстычнай апрацоукі інфармацыі. Па выдзеленых з шуму рухавіка «карысных» сігналах вызначаецца стан яго асобных механічных вузлоу. Тут студэнту даюць магчымасць зрабіць выбар паміж практычнай і тэарэтычнай работай. Такім чынам, ставіцца задача непасрэднага удзелу у рабоце лабараторыі. З першых жа дзён студэнт уключаецца ў работу, на ім ляжыць адказнасць перад таварышамі за агульную справу. Гэта дае магчымасць убачыць дзелавыя якасці чалавека. Важна, каб у студэнта было імкненне разабрацца ва усіх пытаннях да канца, унікнуць ва усе дэталі, праявіць самастойнасць. Вось такім шляхам студэнт трапляе у штат лабараторыі. А далей—ад невялікіх распрацовак на другім курсе да асобных вузлоу і сістэм у цэлым на пятым.

Вынікі работы усёй лабараторыі, а значыць і кожнага студэнта ужо сёння знаходзяць шырокае прымяненне у народнай гаспадарцы. Асноуная форма работ — гаспадарчыя дагаворы. Гэта дазволіла не толькі аснасціць лабараторыю сучасным абсталяваннем, але і матэрыяльна зацікавіць студэнтау.

Паустае пытанне: студэнт увесь вольны час праводзіць у лабараторыі, калі ж ён выконвае курсавыя і дыпломныя работы? Аказваецца, такія работы толькі застаецца аформіць па выніках даследаванняу у СНДЛ.

Сёння у лабараторыі працуюць пяцікурснікі. Валерый Шнітко даследуе магчымасць пабудовы і распрацоувае лічбавы накапіцель акустычных сігналау. Па гэтай тэме лабараторыя заключыла гаспадарчы дагавор з Цэнтральным інстытутам авіяматорабудавання імя Баранава у Маскве на суму 50 000 рублёу. Гэта не значыць, што Валерый адзін выконвае дагавор, ён з'яуляецца адказным за выкананне. Шнітко працуе у СНДЛ з другога курса. Пачынау, як усе, з малых вузлоу, а сёння — самастойная навуковая тэма. Валерый заусёды любой справе аддаецца да канца. На чацвёртым курсе ён займауся пытаннямі пабудовы актыуных фільтрау на аснове аперацыйных узмацніцеляу, а сёння да яго на кансультацыю ідуць не толькі студэнты лабараторыі, але і супрацоўнікі кафедры.

Даследаваннямі магчымасцей пабудовы і распрацоукі дыягнастычнага аналізатара ў рэальным маштабе часу сёння зацікаулены практычна усе маторабудаунічыя арганізацыі. Нашай лабараторыяй будуць выкананы для Міністэрства авіябудауніцтва гасдагаворныя работы іменна па гэтай тэме. А папярэднія даследаванні у гэтым кірунку вядуцца пяцікурснікам Генадзем Астапепкам, які павінен закласці тэарэтычныя асновы для практычнай рэалізацыі новага аналізатара. Генадзь «старажыл» у СНДЛ. Розныя вузлы апаратуры, якія ён самастойна распрацавау, выкарыстоуваюцца на практыцы.

Другі год займаецца Мікалай Скрыган даследаваннямі лічбавых метадау аутаматычнага сачэння за абаротамі авіяматора. Гэта з'яуляецца адной з важнейшых задач лабараторыі, ад рашэння якой будзе залежаць паспяховая рэалізацыя дыягнастычнай апаратуры у цэлым.

На матэрыялах папярэдніх даследаванняу студэнты-пяцікурснікі афармілі свае дыпломныя работы і дапушчаны да абароны. І, зразумела, прыемна усведамляць, што вынікі тваёй работы не стануць здабыткам архіва, а будуць выкарыстоувацца на практыцы, імі будуць кіравацца студэнты малодшых курсау.

Тое ж было і з работамі нашых папярэдніх выпускнікоу — У. Васіленкі, В. Кныша, І. Салановіча, А. Зайцава. У СНДЛ пачыналі і сённяшнія выпускнікі В. Валянцюк, Г. Лічко, А. Сідаровіч, А. Грамыка. Можна з упэуненасцю сказаць, што дзякуючы ведам і вопыту, якія яны атрымалі у лабараторыі, перыяд «акліматызацыі» гэтых рабят на месцы будучай работы будзе нязначным.

Мы расказалі толькі аб сваіх выпускніках, аб тых, чый уклад у агульную справу лабараторыі асабліва значны. А агульныя справы СНДЛ становяцца усё адказней. Калі першым этапам лічыць распрацоуку і выраб аналізатара АНД-1, атрымаушага прызнанне і высокую ацэнку спецыялістау, то другім этапам... Не, гаварыць яшчэ рана. З лабараторыі выносіцца тое, што ужо зроблена. Але ідэі ёсць і сілы ёсць, будзем працаваць.

**У. МІКУЛОВІЧ,**
старшы навуковы супрацоунік, кіраунік СНДЛ.

**А. БЕЛЫ,**
старшы інжынер.



**У вучэбнай лабараторыі спецпрактыкума на кафедры ЗВЧ.**
**Фота Г. МАРОЗАВА.**

# ГАСПАДАРЫЦЬ СЕСІЯ

— У мяне білет быу вельмі добры, — Ларыса Кондраль яшчэ раз адкрывае залікоуку і шчаслівым позіркам акідвае роспіс выкладчыка і слова «выдатна» — першую адзнаку сесіі.

— Дзяучаты, трымайце за мяне палец у чарніле, я пайшла, — і чарговая першакурсніца знікае за дзвярыма з красамоунай шыльдай «Ціха, ідзе экзамен па уводзінах у літаратуразнаўства».

Мы спецыяльна прыйшлі на філалагічны факультэт паміж 9 і 10 гадзінамі раніцы. Іменна у гэты час з-за аблепленых студэнтамі дзвярэй аудыторый вылятаюць першыя «ластаукі». Мы бачылі гэтых шчасліучыкау і у цесным коле сяброу-другакурснікау, якія здавалі сёння экзамен па беларускай мове, і сярод тых, хто экзаменавауся па замежнай мове. Сесія, як нідзе, праяуляецца тут, на філфаку, у гэтым цесным і згуртаваным калектыве. Людныя калідоры, заклапочаныя твары у кабінетах і на кафедрах, амаль ля кожнага вакна — беглая кансультацыя у сябра.

Але калідор застаецца калідорам, а мы з вамі паспрабуем паглядзець, што адбываецца на экзамене, ну, напрыклад, па сучаснай рускай мове.

Іван Клімавіч Германовіч толькі што скончыу апытанне студэнткі і запрасіу адказваць наступную. Тоненькая Антаніна Хатэнка амаль уся схавалася за букетам прыгожых буйных кветак, што стаяць на стале выкладчыка. Апошні уздых, і... Спакойна льецца адказ. У ціхім, утульным пакойчыку кафедры рускай мовы ледзь чутным рэхам аддаюцца тэрміны «залежны стан», «дысіміляцыя», «абрэвіятура». Іван Клімавіч задае многа дадатковых пытанняу — трэба выявіць грунтоунасць і запас ведау. Але робіць ён гэта мякка, тактоуна. Не, што ні кажыце, а атмасфера экзамена самая добразычлівая.

...Іван Клімавіч прыйшоу на філфак БДУ у 1965 годзе з інстытута мовазнауства АН БССР. Цяпер ён дацэнт, паважаны студэнтамі выкладчык. Сёння прымае экзамен у другакурснікау аддзялення рускай і беларускай мовы і літаратуры па курсу словаутварэнне і марфалогія. І хоць практычныя заняткі у экзаменуючыхся вяла іншая выкладчыца — Таццяна Уладзіміраўна Кавалёва, — работа студэнта на працягу семестра улічваецца ім абавязкова.

— А цяпер, Хатэнка,назавіце мне варыянты канчаткау у родным склоне.

Ох, ужо гэтыя варыянты! Пэуна, адно з любімых пытанняу выкладчыкау-філолагау. Антаніна пачала хвалявацца, адказ крыху страціу былую дакладнасць. А за партамі Тоніны сяброукі ціха перажываюць за аднакурсніцу—хіба ж жарты атрымаць «чацвёрку», калі ужо адзін экзамен (па медыцыне) здадзены на «выдатна!» Пасля, за дзвярыма, Тоня сказала:

— Канешне, шкада, што сёння я не «выцягнула» на «пяцёрку»: відаць, недастаткова рыхтавалася. Але і тое праўда: экзамен не з лёгкіх, ахоплівае вялікі аб'ём матэрыялу. Хто ленавауся працаваць на практычных занятках, сёння адчуе сваю памылку.

У заключэнне — кароткае інтэрв'ю Івана Клімавіча.

— Экзамен яшчэ не скончыуся. Ваша ураженне пасля адказау першых студэнтау?

— Вельмі добрае. Выдатна адказвала Тычко, абгрунтавана, важка, прыклады прыводзіла слушныя, граматычны і марфалагічны разбор зрабіла бездакорна. Апошняе я вельмі цаню, бо пры разборы праяуляецца здольнасць студэнтау прымяняць тэарэтычныя веды на практыцы.

Ціхенька прыкрываем дзверы. Не трэба перашкаджаць складанаму спецыфічнаму працэсу экзамена.

Калідор зноу сустракае пераклічкай галасоу, прыглушаным шамаценнем старонак.

— Забылася, што такое санет. Памятала, памятала, і раптам выскачыла...

Зноу гэтыя першакурснікі! Больш за усіх хвалююцца, перагаворваюцца. А ці не такімі калісьці былі мы?..

**С. УСЦІНОВІЧ.**





**На здымках:** дацэнт **І. К. Германовіч** вядзе апытанне другакурсніцы **В. Сідаровіч.**
Фота **Т. Сахашчык.**

# ПРЫКЛАД ЛЕПШЫХ

Калі сказаць, што інтэрнат — родны дом для студэнта, то каму-небудзь гэта здасца зусім банальным. Але куды дзенешся, калі на самай справе гэта так і ніхто адмауляць факта не будзе, бо студэнт праводзіць у інтэрнаце большую частку свайго часу: рыхтуецца да заняткау, адпачывае. Жывучы у ім, студэнт становіцца часткай вялікага інтэрнацкага калектыву. І ні для каго не сакрэт, што іменна ад умення студсавета аб'яднаць жыхароу інтэрната у адзіны дружны калектыу залежыць, быць яму родным домам для студэнта ці проста гасцініцай, у якой можна знайсці прытулак толькі на ноч.

Інтэрнат № 1 з'яуляецца адным з лепшых інтэрнатау нашага універсітэта. Ён заняу першае месца ў агляд-зе-конкурсе на лепшы інтэрнат, які праводзіуся прафкомам універсітэта. Яму прысуджаны пераходны чырвоны сцяг. Галоуная заслуга у гэтым студсавета. Нядрэнна было б, калі б вопыт яго работы пераняді студэнцкія саветы іншых інтэрнатау.

— Яшчэ з пачатку навучальнага года на пасяджэнні актыву інтэрната мы прадумалі усё да дробязей, — гаворыць старшыня студсавета, студэнт II курса гістфака Віталій Сілін.—Праўда, сёе-тое не атрымалася. Але галоуную сваю задачу— зрабіць як мага лепшымі адпачынак і быт студэнтау — мы выканалі.

Паглядзім, што канкрэтна зроблена за гэты год. Па прапанове студсавета сіламі інтэрната пераафармлены Ленінскі пакой. І зараз сюды з ирыемнасцю прыходзяць адпачываць студэнты. Тут студсавет праводзіць вечары адпачынку, цікавыя сустрэчы. За гэты год гасцямі студэнтау былі работнікі Дома мадэлей, артысты Беларускай філармоніі, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, перадавікі вытворчасці. Студсавет арганізавау і правёу цыкл лекцый, прысвечаных трыццацігоддзю Дня Перамогі у Вялікай Айчыннай вайне. Але не заусёды студэнты могуць пабываць на мерапрыемствах. І гэта не віна студсавета. У інтэрнаце жыве звыш трохсот чалавек, а пакой разлічаны крышку больш, чым на 60. Вось і атрымліваецца, што мерапрыемства праводзіцца, а прыняць у ім удзел няма ніякай магчымасці.

Для паляпшэння умоу для заняткаў студсавет вырашыу стварыць у чытальнай зале сваю невялікую бібліятэку. Прынеслі шафы, дамовіліся з універсітэцкай бібліятэкай, каб з яе боку атрымаць дапамогу у набыцці кніг. Але калі дайшло да справы, то выявілася, што бібліятэка можа забяспечыць інтэрнат толькі першакрыніцамі. Ніводнага вучэбнага дапаможніка у шафах інтэрнацкай бібліятэкі не аказалася. На гэтым справа спынілася. Ці таму, што работнікі бібліятэкі не зразумелі ініцыятывы студэнтау, ці проста аднесліся да яе з прахаладай.

Добра і цікава працуе інтэрнацкі радыёвузел. Два разы у месяц вечарам з рэпрадуктара гучаць словы: «Увага! Гаворыць радыёвузел інтэрната № 1». Студэнты з цікавасцю слухаюць паведамленні аб жыцці інтэрната, сучасную музыку. Лепшыя пакоі атрымліваюць музычныя падарункі. Крытыкуюцца пакоі, якія не вызначаюцца чысцінёй і парадкам. Дарэчы сказаць, што у іншых інтэрнатах радыёвузлы або зусім адсутнічаюць, або амаль не працуюць.

Немалаважнае месца у жыцці інтэрната займае насценная газета «Наш быт». З прыходам у рэдакцыю Мікалая Шуміка газета ажывілася, стала больш змястоунай, прыгожа аформленай.

Але усё ж першарадную увагу студсавет удзяляе санітарнаму стану інтэрната. За чысціню паверха адказваюць дзяжурныя, якія назначаюцца па чарзе. Акрамя гэтага, студсавет часта праводзіць праверкі санітарнага стану пакояў. Тры пакоі, якія вызначаюцца чысцінёй на працягу месяца, атрымліваюць спецыяльныя прызы студсавета. За гэты год вызначыліся чысцінёй пакоі № 55, № 120, № 100, № 7 і іншыя. Разам з тым вядзецца непрымірымая барацьба з неахайнымі жыхарамі. Іх выклікаюць на пасяджэнні студсавета, выносяць вымовы. Калі ж гэта не дапамагае, прымаецца крайняя мера — высяленне з інтэрната. Але такія выпадкі бываюць рэдка.

Вось толькі некаторыя справы студсавета інтэрната № 1. Прыклад іх работы, безумоуна, заслугоувае увагі.

**М. ШЧАРБАЧЭНЯ,**
**В. ХАРОШКА,**
**студэнты журфака.**



**Народны кантроль**

## СТАРОНКА № 10

# НЕ ПАЎТАРАЦЬ ПАМЫЛАК

Да канца летняй экзаменацыйнай сесіі засталося зусім мала часу. Напярэдадзе канікулы, да правядзення якіх трэба правесці добрую арганізацыйную работу. Неабходна, каб студэнты, паспяхова здаўшыя экзамены, паспелі да ад'езду дадому ці у будатрады атрымаць стыпендыю за летнія месяцы.

У свой час У. І. Ленін указваў, што, аналізуючы памылкі учарашняга дня, мы тым самым вучымся пазбягаць памылак сёння і заўтра. Кіруючыся гэтым указаннем, група народнага кантролю універсітэта правяла праверку назначэння і выплаты стыпендый студэнтам за летнія канікулы 1974 года.

**У выніку праверкі ўстаноўлена, што стыпендыяльныя камісіі факультэтаў са спазненнем перадалі ў рэктарат матэрыялы, неабходныя для выдання загаду аб назначэнні стыпендый. Таму загады былі падпісаны ўжо пасля таго, як студэнты паехалі на канікулы. Такім чынам, студэнты атрымалі стыпендыю толькі ў канцы жніўня, а на радзе факультэтаў — у канцы верасня — пачатку кастрычніка.**

Такое становішча з'яўляецца ненармальным, яно супярэчыць пастанове ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 18 кастрычніка 1971 года «Аб мерах па далейшаму паляпшэнню матэрыяльных і жыллёва-бытавых умоў студэнтаў вышэйшых і навучэнцаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў».

**Для таго, каб такое становішча не склалася і ў гэтым годзе, дэканам факультэтаў неабходна звярнуць асобую увагу на работу стыпендыяльных камісій, абавязаць іх своечасова прадставіць матэрыялы аб выплаце стыпендый у рэктарат.**

Прафсаюзнаму камітэту універсітэта трэба разгледзець пытанне аб выплаце стыпендый і абавязаць прафсаюзныя бюро факультэтаў узмацніць кантроль за няўхільным выкананнем названай пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР, а таксама Інструкцыі аб парадку назначэння і выплаты стыпендый студэнтам ВНУ.

Факультэцкія групы народнага кантролю абавязаны сістэматычна кантраляваць правільнасць і своечасовасць назначэння і выплаты стыпендый.

**Я. ТАГУНОЎ,**
старшыня **ГНК БДУ.**

# ПРАЦАВАЦЬ ЯШЧЭ ЛЕПШ

**У канцы мая Кастрычніцкім раённым камітэтам народнага кантролю г. Мінска была прынята пастанова «Аб рабоце групы народнага кантролю Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна». У сувязі з гэтым мы друкуем артыкул старшыні Кастрычніцкага раённага камітэта народнага кантролю А. ПШОНІНА.**

Пад кіраўніцтвам партыйнага камітэта група народнага кантролю Белдзяржуніверсітэта праводзіць значную работу па здзяйсненню кантролю за выкананнем дырэктыў партыі і урада. Ва універсітэце 17 груп і адзін пост, у складзе якіх 250 чалавек. У саставе кантралёраў 83% выкладчыкаў і супрацоўнікаў і 17% студэнтаў. Групы народнага кантролю (11—25 чалавек) ёсць на кожным факультэце. Галаўную групу узначальвае кандыдат юрыдычных навук, дацэнт Я. М. Тагуноў.

Амаль усе групы народнага кантролю працуюць актыўна і аказваюць вялікую дапамогу у рабоце адміністрацыі і партыйнага камітэта.

**Увага народных кантралёраў звернута на зберажэнне матэрыяльных каштоўнасцей, захоўванне, улік і расходаванне рэактываў і абсталявання, выкарыстанне працоўнага часу, санітарны стан буфетаў і сталовых, якасць прыгатаваных страў, выкарыстанне вучэбнага часу студэнтаў, правільнасць вызначэння аб'ёму вучэбнай нагрузкі выкладчыкаў, укараненне у вучэбны працэс тэхнічных сродкаў навучання і іншыя пытанні.**

Толькі за апошні год галаўная група народнага кантролю правяла 24 праверкі, накіраваныя на паляпшэнне работы кафедр і універсітэта у цэлым. Матэрыялы праверак, як правіла, абмяркоўваюцца на бюро і сходах народных кантралёраў, на пасяджэнні партыйных, мясцовых і прафсаюзных камітэтаў універсітэта, прымаюцца меры па ліквідаванню недахопаў.

У рабоце галаўной групы склалася такая практыка, калі па матэрыялах праверак заслухоўваюцца тлумачэнні адказных асоб, вызначаюцца тэрміны ліквідавання недахопаў і устанаўліваецца кантроль за выкананнем рэкамендацый народных кантралёраў. Ва ўсіх групах створаны сектары, якія у большасці вядуць мэтанакіраваную і актыўную работу. Перыядычна работа факультэцкіх груп правяраецца галаўной групай.

З народнымі кантралёрамі вядзецца вучоба, у працэсе якой разглядаюцца пытанні, якія датычацца дзейнасці народных кантралёраў. Абагульняецца станоўчы вопыт работы асобных груп, сектараў і народных кантралёраў.

**Народныя кантралёры падтрымліваюць цесную сувязь з «Камсамольскім пражэктарам», разам з ім праводзяць рэйды і праверкі, выпускаюць «маланкі» і сатырычныя лісты. Галаўной і факультэцкімі групамі ўдзяляецца вялікая увага галоснасці у рабоце. Матэрыялы праверак і паўсядзённая работа кантралёраў сістэматычна асвятляюцца у шматтыражцы універсітэта, на стэндах «Народны кантроль у дзеянні». Старшыні груп, кіраўнікі сектараў і асобныя народныя кантралёры перыядычна інфармуюць калектыў аб сваёй рабоце.**

Разам з тым у рабоце асобных факультэцкіх груп ёсць недахопы. Групы народнага кантролю юрыдычнага, матэматычнага і філалагічнага факультэтаў не надаюць значнай увагі галоснасці. У групе народнага кантролю фізфака не вядзецца дзённік уліку праводзімай работы.

Не ва ўсіх групах народнага кантролю праводзіцца рэгулярная вучоба з кантралёрамі, а галаўная група не надае гэтаму асобай увагі. Народныя кантралёры не заахвочваюцца за іх актыўную работу адміністрацыяй універсітэта.

Будзем спадзявацца, што групы народнага кантролю БДУ у далейшым яшчэ больш актывізуюць сваю работу, ліквідуюць адзначаныя недахопы.

# ВЫНІКІ АГЛЯДУ

Развіццё галоснасці ў рабоце усіх груп народнага кантролю універсітэта — важная задача, якая пастаянна павінна знаходзіцца у цэнтры увагі. Ад рашэння гэтай задачы у значнай ступені залежаць нашы поспехі у здзяйсненні народнага кантролю, таму што галоснасць — выпрабаваная часам зброя, якая дае магчымасць шматразова памнажаць сілу уздзеяння народнага кантролю.

З 15 па 30 мая ва універсітэце праходзіў IV агляд сродкаў галоснасці у рабоце груп народнага кантролю. У ім прымалі ўдзел факультэцкія групы, а таксама групы народнага кантролю іншых структурных падраздзяленняў універсітэта (адміністрацыйна-гаспадарчай часткі, ваеннай кафедры і інш.).

**Мэтай агляду з'явілася:**

**— ацэнка стану галоснасці як аднаго з важнейшых прынцыпаў дзейнасці груп;**

**— высвятленне таго, як у рабоце груп выкарыстоўваюцца разнастайныя формы галоснасці для павышэння дзейснасці народнага кантролю;**

**— абагульненне вопыту работы груп народнага кантролю і прыняцце мер да шырокага распаўсюджвання лепшых прыёмаў укаранення галоснасці у паўсядзённую работу;**

**— далейшае пашырэнне ўдзелу членаў калектываў факультэтаў і іншых структурных падраздзяленняў у дзейнасці народнага кантролю, у барацьбе за далейшае умацаванне працоўнай дысцыпліны і сацыялістычнай законнасці.**

Асноўная увага была звернута на тое, як аформлены стэнды народнага кантролю, як расказваецца аб дзейнасці груп. Пры падвядзенні вынікаў улічвалася таксама рэгулярнасць выступленняў старшынь груп на партыйных і прафсаюзных сходах з паведамленнямі аб выніках дзейнасці народных кантралёраў, перыядычнасць публікацый матэрыялаў аб рабоце ГНК у факультэцкай насценнай газеце і ва універсітэцкім друку.

Як паказалі вынікі агляду, лепш за ўсіх ідуць справы на біялагічным і хімічным факультэтах. Групы народнага кантролю гэтых факультэтаў маюць свае стэнды, на якіх рэгулярна вывешваюцца пастановы, прынятыя па выніках праверак. ГНК працуюць у цесным кантакце з «Камсамольскімі пражэктарамі» факультэтаў.

Добра выкарыстоўваюць сродкі галоснасці у рабоце ГНК фізічнага, гістарычнага факультэтаў і факультэта журналістыкі.

Аднак неабходна адзначыць, што ГНК ФПМ і ваеннай кафедры не маюць нават спецыяльных стэндаў.

Зусім дрэнна пастаўлена галоснасць у рабоце групы народнага кантролю філалагічнага (старшыня Г. Сіненка) і юрыдычнага (старшыня А. Прымачонак) факультэтаў. Нягледзячы на неаднаразовыя ўказанні універсітэцкай групы народнага кантролю, старшыні груп гэтых факультэтаў не прынялі ніякіх мер для ліквідацыі недахопаў.

**Улічваючы вынікі агляду, камісія размеркавала месцы наступным чынам:**

**I — хімічны (старшыня Г. Васільева) і біялагічны (старшыня А. Сцефановіч) факультэты;**

**II — гістарычны (старшыня І. Літвіноўскі) і фізічны (старшыня А. Серафімовіч) факультэты;**

**III — факультэт журналістыкі (старшыня С. Говін).**

**А. АКІНЧЫЦ,**
**намеснік старшыні ГНК БДУ.**

# ЯК ДАПАМАГЧЫ?

Першы курс... Розных узростаў юнакоў і дзяўчат сабраў універсітэт. У каго за плячамі двухгадовы, трохгадовы стаж, а каму і пасля школьнай парты пашчасціла трапіць сюды. Новыя знаёмствы, новыя уражанні, ды і само жыццё цячэ па новым русле. Але не хлебам адзіным жыве чалавек. Таму і не лекцыямі адзінымі запоўнена жыццё студэнта.

Многа ўжо было сказана аб тым, як праводзяць свой вольны час студэнты ў інтэрнаце. Але наша гаворка будзе аб тых, хто не змог трапіць туды і зараз жыве на кватэры. Гэта пытанне асабліва датычыць першакурснікаў, таму што большасць іх жыве на кватэрах.

**Трэба сказаць, што кватэры — пытанне для студэнтаў даволі складанае. Часта і дабірацца да іх далёка, нязручна. Вядома, умовы не зусім спрыяльныя. Ды і гэтыя 15 рублёў зусім не лішнія для студэнта. І ўсё ж амаль палавіна студэнтаў на кожным факультэце жыве не ў інтэрнаце. Зразумела, што ім патрэбна дапамога. І найбольшую, бясспрэчна, павінен аказваць прафком.**

Кожны раз у пачатку навучальнага года прафком дае ў гарадской газеце «Вячэрні Мінск» аб'яву. У ёй ён просіць асоб, у якіх ёсць свабодная жыллёвая плошча, прысылаць адрасы. Між іншым, многія прысылаюць і бяруць ахвотна студэнтаў з універсітэта.

Але да гэтага, яшчэ ў маі—чэрвені бюро прафкомаў факультэтаў размяркоўваюць месцы у інтэрнатах. Тыя, хто не атрымаў месца ў інтэрнаце, прыязджаюць на 2—3 дні раней пачатку навучальнага года. Яны шукаюць сабе кватэры па указаных адрасах.

**Студэнтам, у якіх цяжкае матэрыяльнае становішча, аказваецца грашовая дапамога ў размеры 25—30 рублёў з фонду прафкома. Акрамя таго, існуе 30-працэнтны стыпендыяльны фонд. Гэта так званая рэктарская дапамога. Яе размяркоўвае дэканат кожнага факультэта. Але тут ён не абыходзіцца без прафкома, які больш ведае аб матэрыяльным становішчы студэнтаў.**

Вось у якім становішчы знаходзяцца справы на юрыдычным факультэце, старшыня бюро прафкома якога Валерый Кудзін. Тут студэнты атрымліваюць, як і на іншых факультэтах, матэрыяльную дапамогу. Гэта ў першую чаргу тыя, хто не атрымлівае стыпендыі і жыве на кватэры. У асноўным пры размеркаванні дапамогі улічваюцца умовы жыцця студэнта, а потым паспяховасць.

Справа гэта яшчэ абцяжарваецца тым, што сярэдні ўзрост студэнта на факультэце — 24 гады. Многія ужо сямейныя, іх не могуць забяспечыць інтэрнатам, а стыпендыя ва ўсіх аднолькавая.

**Акрамя таго, прафорг кожнага курса павінен быць азнаёмлены са становішчам кожнага студэнта, які жыве на кватэры. Вядома, і гэта справа вядзецца. Вось, напрыклад, студэнты юрыдычнага факультэта Савіцкі і Касценка жылі дзесьці ў «часоўцы». Не было спрыяльных умоў для жыцця, для падрыхтоўкі да заняткаў. Прыехаў іх прафорг, паглядзеў на такія ўмовы жыцця і дабіўся пераводу ў інтэрнат, дзе якраз былі свабодныя месцы.**

Але вядома і тое, што большасць прафоргаў не ведаюць аб умовах жыцця сваіх студэнтаў на кватэрах. У выніку такое пытанне, як дапамога прафкома студэнтам, якія жывуць на кватэрах, з'яўляецца злабадзённым.

**С. ГЕРАСІМАВА,**
**Т. ХОРСУН.**

# СПАРТЫЎНЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

Закончыуся яшчэ адзін вучэбны семестр. Ідзе сесія. Усе сілы цяпер сканцэнтраваны у напрамку — здаць экзамены на «добра» і «выдатна». Здавалася б, у такія гарачыя для выкладчыкау і студэнтау дні грамадская работа сама сабой адкладваецца на другі план. Аднак на факультэце журналістыкі думаюць аб гэтым інакш. Студэнты ужо сёння плануюць работу на наступны семестр. Абмяркоуваюцца магчымасці кожнага сектара камітэта камсамола на наступны вучэбны год. Абмяркоуваюцца спартыуныя перспектывы факультэта. Як вядома, спартыуныя рэзервы журфака невялікія: усяго 350 студэнтау. Але дзякуючы плённай працы, якая праводзіцца адказным за спартыуную работу на факультэце У. Яжовым і членамі спортбюро студэнтамі I курса С. Каганам, П. Дарашчонкам і іншымі, каманды-удзельніцы агульнауніверсітэцкай спартакіяды дасягнулі значных поспехау у параунанні з мінулым годам.

Спратсмены - журналісты занялі першае месца у асеннім і вясеннім кросах. Паспяхова выступілі у першынствах універсітэта па футболу і ручному мячу. На факультэце прайшлі спаборніцтвы па валейболу, баскетболу і лёгкай атлетыцы.

Члены спортбюро факультэта адзначылі найбольш актыуных студэнтау-спартсменау. Сярод іх С. Каган, Р. Кісель, майстар спорту па мастацкай гімнастыцы Н. Гарбунова і іншыя. Яны узнагароджаны ганаровымі граматамі. Рыхтуючыся да асенніх стартау наступнага навучальнага года, спартсмены факультэта вырашылі актыуна весці работу па папулярызацыі спорту.

Асаблівая увага пры складанні планау факультэцкіх спартыуных секцый звернута на шырокую прапаганду спорту сярод першакурснікау. Закрануты пытанні аб спартыуным інвентары, нагляднай агітацыі, вопыце лепшых спартсменау.

**А. САЛАНЕНКА.**

# ДОБРЫЯ ТРАДЫЦЫІ

Вялікіх поспехау дасягнуу факультэт прыкладной матэматыкі у розных галінах дзейнасці за 5 год свайго існавання. Асабліва хочацца адзначыць яго спартыуныя дасягненні. За перыяд з дня заснавання ФПМ прайшоу шлях ад навічка у спартыуным калектыве БДУ да лідэра. Двойчы факультэт станавіуся пераможцай агульнауніверсітэцкіх спартакіяд, тры гады запар выходзіу пераможцай агляду-конкурсу на лепшую пастаноуку спартыуна-масавай работы, праводзімага рэктаратам, парткомам, камітэтам камсамола і спартыуным клубам БДУ і узнагароджаны пераходным Чырвоным сцягам. На высокім узроуні на факультэце ідзе работа па арганізацыі і правядзенню комплексу ГПА, агітацыі і прапагандзе фізкультуры і спорту.

Пашыраюцца сяброускія сувязі факультэта. У маі гэтага года у г. Кіеве адбыуся I этап фестывалю спартыунай дружбы Кіеускага і Беларускага універсітэтау на прызы газет «Вячэрні Кіеу» і «Вячэрні Мінск». БДУ на фестывалі прадстауляу ФПМ, КДУ — факультэт кібернетыкі (пераможца спартакіяды КДУ). У праграме спаборніцтвау былі сустрэчы па валейболу, баскетболу, шахматах, шашках, мастацкай гімнастыцы. Спаборніцтвы прайшлі у цікавай і напружанай барацьбе. Дружна і упэунена выступілі нашы каманды, і узнагародай за гэта быу галоуны прыз першага этапа — кубак газеты «Вячэрні Кіеу». Спаборніцтвы выклікалі вялікую цікавасць у студэнтау КДУ. Фестываль унёс вялікі уклад ва умацаванне дружбы паміж вядучымі ВНУ нашых рэспублік. Вельмі б хацелася, каб гэтыя сувязі сталі традыцыйнымі і больш пашыранымі.

Другі этап фестывалю адбудзецца у кастрычніку у г. Мінску.

**П. ГЕРАСІМОВІЧ,**
**намеснік старшыні спортклуба БДУ, член камітэта камсамола.**



**На здымку:** момант сустрэчы па шахматах паміж камандамі ФК КДУ і ФПМ БДУ. Фота **А. Суворава** і **П. Герасімовіча.**

## ЗДЫМАЮЦЬ ФОТААМАТАРЫ



ТАЛІН

**Фота А. Цыгулёва.**

# А ДЗЕ ЛАЎРЫ?

На агульнауніверсітэцкім аглядзе-конкурсе мастацкай самадзейнасці многія былі сведкамі вялікага поспеху студэнцкага тэатра мініяцюр факультэта журналістыкі. На суд журы і гледачоу была прадстаулена новая праграма тэатра «Студэнцкія сны».

Адгрымелі апладысменты, выказала свае меркаванні журы... Дзейнасць СТМ на гэтым не скончылася. За адзін толькі красавік стэмауцы пабывалі двойчы у сваіх падшэфных, у прафтэхвучылішчы № 34 чыгуначнікау, выступілі з канцэртам у вучылішчы № 32 паліграфістау, паказалі сваю новую праграму у Вышэйшай партыйнай школе г. Мінска. На першы погляд не так ужо і многа, аднак калі зыходзіць з умоу, у якіх працуе студтэатр, то на многае разлічваць вельмі цяжка. Рэпетыцыі праходзяць у вучэбных аудыторыях, а часам нават у інтэрнаце. Няма і сваёй формы у самадзейных артыстау. Рэквізіт, які мае СТМ, — гэта два самаробныя шчыты ды медная аркестравая талерка.

Зразумела, справа не толькі у рэквізіце, але і ва ўмовах. Урэшце ініцыятары сваёй справы, людзі, захопленыя мастацтвам, заусёды гатовы перамагаць цяжкасці. На жаль, не заусёды усё залежыць ад нас, але атрымаць падтрымку і дапамогу ад кіруючых таварышау, хаця б ад прафкома, часцей за усё немагчыма.

Чаго каштуюць спробы узяць аутобус для выезду агітбрыгады або студтэатра з канцэртам у святочны або выхадны дзень! Міжволі пасля такіх чарговых нягод задаеш пытанні: «Навошта мы усё гэта робім? Каму гэта патрэбна? Хто зацікаулены у нашых выездах з канцэртамі ды і наогул у развіцці універсітэцкай самадзейнасці?».

Успомнім недалёкае мінулае — правядзенне апошняга агульнауніверсітэцкага агляду-конкурсу мастацкай самадзейнасці, які быу арганізаваны рэктаратам, парткомам, прафкомам, мясцкомам, камітэтам камсамола. Было створана журы, складзены графік правядзення агляду, устаноулены узнагароды за прызавыя месцы. Не было прадумана толькі пытанне аб чарговасці рэпетыцый у актавай зале, з-за чаго на працягу усяго агляду адбываліся штодзённыя спрэчкі паміж факультэтамі.

Але і гэта ужо ззаду. Агляд закончыуся. Аб'яулены пераможцы, вызначаны ім граматы і прэміі... Час ідзе, а аб узнагародах і заахвочваннях пераможцау чым далей, тым больш забываюць кампетэтныя інстанцыі.

Акрамя таго, у канцы 1974 года СТМ журфака заняу першае месца сярод агіттэатрау універсітэта. Журы афіцыяльна аб'явіла аб сваім рашэнні і дадало, што пераможцы узнагароджваюцца паездкай у горад-герой Брэст. Мы доуга чакалі выканання гэтага абяцання. Але час прайшоу. Зараз у прафкоме і слухаць не хочуць аб рашэнні кампетэнтнага журы. Можа яно ужо страціла сілу?

**А. ПРАСТАТА,**
**студэнт журфака.**

## ГУМАРЫСТЫЧНЫ ПЕРАПЫНАК

**Набліжаецца лета—гарачая пара работы студэнцкіх будаунічых атрадау. Пачынаючым будаунікам мы прысвячаем гэты вясёлы «будаунічы» слоунік:**

**МАЛЯРИЯ — побелочно-покрасочные работы.**

**ОТВЁРТКА — ответ не по существу.**

**БИТУМ — старорежимное наказание.**

**БЛОКНОТ — отсутствие на стройке блоков.**

**БРА — незавершённый брак.**

**РАСТВОР — открытие.**

**ОПАЛУБКА — покраска палубы.**

**ОТБИВНАЯ — работа с отбойным молотком.**

**ЯМЩИК — человек, работающий в котловане.**

# АДНОЙЧЫ...

Вядомы нямецкі прафесар Вірхау прымау аднойчы экзамены у сваіх выхаванцау.

— Што вы будзеце рабіць, калі да вас звернецца хворы з вывіхам сківіцы? — спытау прафесар аднаго са студэнтау.

— У такіх выпадках часта дае вельмі добрыя вынікі моцны і нечаканы удар па вывіхнутай сківіцы. Я, прафесар, паспрабавау бы яму гэта зрабіць.

Прафесар задаволена усміхнууся:

— А што б вы зрабілі потым?

— Потым? Калі б гэта быу з выгляду моцны чалавек, то я пасля некалькі б адхіліуся, каб адразу не атрымаць удар у адказ.

***

Неяк, вярнуушыся з падарожжа, Эдысон паскардзіуся жонцы на страшэнны галауны боль: «Я не пераношу язды, калі давозіцца сядзець спіной па напрамку руху поезда».— «Але чаму ты не папрасіу каго-небудзь з суседзяу памяняцца з табой месцамі?» — спытала жонка. «Я не мог гэтага зрабіць, — з сумнай усмешкай адказау вынаходнік,— я ж быу адзіным пасажырам у купэ».

## ГУМАРЫСТЫЧНЫ ПЕРАПЫНАК






— Ты адзін мяне разумееш...




«Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2 000 экз. Аб'ём — 1 друк. ар. АТ 06766 Заказ № 918.

Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.